*ДУА “Сярэдняя школа № 9 г. Маладзечна”*

# План-канспект
# урока беларускай мовы ў 6 класе па тэме
# “Прыметнікі з суфіксам -ск-, іх вымаўленне і правапіс”

*Настаўнік*
*Алексяёнак С.Ю.*

Маладзечна 2020

**Тэма: Прыметнікі з суфіксам –ск-, іх вымаўленне і правапіс**

**Мэты:**

1) *адукацыйная*: дапамагчы вучням засвоіць правілы вымаўлення і напісання адносных прыметнікаў, тлумачыць умовы напісання суфікса –ск-, пазнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам;
2) *развіццёвая:* развіваць уменне вызначаць разрад прыметнікаў, утваральную аснову, канцавы зычны, ужываць правільна прыметнікі ў вусным і пісьмовым маўленні, развіваць пазнавальную актыўнасць, творчыя здольнасці вучняў, арфаграфічную пільнасць;
3) *выхаваўчая:* фарміраваць нацыянальную свядомасць вучняў, павагу да свайго народа, імкненне захоўваць чысціню роднай мовы, выхоўваць цікаўнасць, кемлівасць, дапытлівасць, назіральнасць;
4) *здароўезберагальная:* стварыць умовы для развіцця лагічнага аналітычнага мыслення, для развіцця самакантролю, самаарганізацыі, самааналізу, спрыяць на ўроку сітуацыі поспеху, задавальнення і радасці.

**Тып урока:** камбінаваны, вывучэнне новага матэрыялу.

**Метады і прыёмы:** гульнёвая, ілюстрацыйна-наглядная, індывідуальная, калектыўная, групавая работа, работа з тэставымі заданнямі, падручнікам, з прэзентацыяй.

**Асноўны метад:** праблемна – пошукавы.
**Тэхналогіі: ІКТ**
**Абсталяванне:** Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа, аўтары В.П.Красней, Я.М.Лаўрэль, С.Р.Рачэўскі, 2009 г.; Беларуская мова: тэставыя заданні для 6 класа ў дзвюх частках, частка 1; мультымедыйная ўстаноўка; прэзентацыя па тэме; апорныя карткі для вучняў.

## Ход урока

### 1.Арганізацыйна-матывацыйны этап

### Стварэнне эмацыянальнага настрою

Урок пачынаем адной з залацінак нашай мовы - вобразнай, вольнай і пявучай.

**Слова настаўніка.** Добры дзень, шаноўнае спадарства! Спадзяюся, што ён для вас сёння сапраўды добры, тым больш, што нам усміхаецца ўсё наваколле, сонейка, неба, хмаркі. Кожная сустрэча пачынаецца словамі ветлівасці, тымі словамі, якія выклікаюць жаданне працаваць, імкнуцца да чаго-небудзь, марыць і проста жыць:

*Ільняная і жытнёвая. Сялянская.*

*Баравая ў казачнай красе.*

*Старажытная. Ты самая славянская.*

*Светлая, як травы у расе.*

*Вобразная, вольная, пявучая,*

*Мова беларуская мая!*
*Пімен Панчанка*

Я хачу, каб спадарожнікам на нашым уроку было матчына слова.

### 2. Актуалізацыя ведаў. Паўтарэнне вывучанага раней матэрыялу.

Для паспяховай працы нам спатрэбіцца поўная загрузка, і загружацца будзем праз паўтарэнне ужо вядомага нам матэрыялу.

Звернемся да эпіграфа.

*Франтальнае апытанне*

Словы якой часціны мовы пераважаюць у гэтых радках. (Прыметнік)
Якая часціна мовы называецца прыметнікам?
На якія разрады падзяляюцца прыметнікі па значэнні?

А зараз уявіце, што вы вучні 11 класа, вам трэба выканаць некалькі тэставых заданняў.

*Тэставыя заданніі на слайдах (гл.дадатак).*

Малайцы, я задаволена вамі, справіліся.

**3.Вызначэнне тэмы. Стварэнне праблемнай сітуацыі. Пастаноўка мэт і задач урока.**

**Настаўнік.** Загрузка прайшла цудоўна і перакінула ў краіну Пошуку і Ведаў. Сёння мы паспрабуем разам знайсці адну ісціну. Не бойцеся памыліцца, паразважаць. Мы будзем узбірацца на вяршыню піраміды ведаў, выконваючы заданні, правяраючы і ацэньваючы сябе і сваіх сяброў. Для гэта патрабуецца вызначыць тэму і паставіць перад сабой мэты.

Прыметнік аздабляе нашу мову, робіць яе прыгажэйшай, і ў той жа час тоіць у сябе сакрэты, асаблівасці. Сёння раскрыць адзін сакрэт прыметніка, я вам і прапаную.

- Запішыце слова *студэнт* і дадайце да яго суфікс –ск-, якое слова ўтварылася? А як правільна трэба запісаць *студэнцкі* або *студэнтцкі ці студэнтскі?* Вы ведаеце? Не. Вызначаем, што будзем вывучаць на ўроку.

Тэма*: Прыметнікі з суфіксам –ск-, іх вымаўленне і правапіс*. Сфармуліраваць мэты ўрока нам дапамогуць дзяжурныя словы на слайдзе.

**Слайд “Дзяжурныя словы”**

Працаваць
Вывучаць
Аналізаваць
Вызначаць
Тлумачыць
Утвараць
Паўтараць
Размаўляць

**Настаўнік.** Зыходзячы з тэмы, вызначым, што мы павінны ведаць і ўмець у канцы ўрока.

**Ведаць:** якія асаблівасці маюць адносныя прыметнікі пры ўтварэнні з дапамогай суфікса –ск-.

**Умець:** тлумачыць, аналізаваць і ўтвараць прыметнікі з дапамогай суфікса –ск-.

**4.Знаёмтва з новай тэмай.**

Адразу пачынаецца трэніроўка памяці, якая садзейнічае эфектыўнасці навучання. Вочы – фатаапараты. Робім фатаграфіі. Ставім на памяць і блакіроўку.

**Ведайце!**

**Лінгвістычны каментарый настаўніка.** (работа з апорнай карткай, яна знаходзіцца на партах у вучняў і на слайдзе)

| Правілы | Прыклады |
|---|---|
| **з суфіксам -ск-** | |
| утваральная аснова заканчваецца на:<br>**с + -ск- = ск**<br>**д + -ск- = дск [цк]**<br>**ц**<br>**т + -ск- = цк**<br>**ч**<br>**к** | *беларус – беларускі,*<br>*сусед – суседскі*<br>*сакавік – сакавіцкі,*<br>*студэнт – студэнцкі,*<br>*выдавец – ведавецкі,* |
| **г + -ск- = гск**<br>**ж + -ск- = жск**<br>**з + -ск- = зск**<br>**х + -ск = хск**<br>**ш + -ск- = шск**<br>} **калі гэта назва нацыянальнасці, народнасці, геаграфічная назва** | *Рыга – рыжскі,*<br>*Тонеж – тонежскі,*<br>*кіргіз – кіргізскі,*<br>*Каўказ – каўказскі,*<br>*чэх – чэшскі,* |
| **Выключэнне!** | *Калмык-калмыцкі, турак-турэцкі* |
| **нь + -ск- = ньск (ад назваў месяцаў)**<br><br>слова ***восень*** **+ -ск- = ньск** | *Студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, жнівеньскі, восеньскі* |
| **нь + -ск- = нск (не назва месяца)** | *Смаргонь – смаргонскі,*<br><br>*Астрахань - астраханскі* |

Звяртаецца ўвага вучняў зноў на слова “студэнцкі”.

Ведаючы сакрэт суфікса –ск-, скажыце: “Які варыянт ад слова *студэнт* будзе правільны і чаму?”

### 5. Фарміраванне першасных уменняў і навыкаў

**Настаўнік.** Герой нашага ўрока суфікс -ск-. Каб глыбей зразумець і разабрацца ў асаблівасцях напісання суфікса -ск- трэба зазірнуць у моўную скарбонку і ўбачыць тое, што на першы погляд схавана.

**Настаўнік.** Вучоны без практыкі, што пчала без мёду.

**Работа з падручнікам. Практыкаванне №240**

**Проба сіл.** Вучні, карыстаючыся алгарытмам, каменціруюць утварэнне і правапіс прыметнікаў у практыкаванні, аналізуюць, звяртаюць увагу на ўтварэнне і правапіс прыметнікаў.




**Гульня "Чацвёртае лішняе"**

1.казанскі, хатынскі, снежаньскі, конскі.
2. суседскі, лідскі, беларускі, гарадскі.
3.ткацкі, студэнцкі, палескі, рыбацкі.

Малайцы, усе справіліся з заданнем**.** У якасці ўзнагароды адпраўлю вас ў віртуальнае падарожжа па гарадах Беларусі.

**Заданне:** Ад назваў горадоў на слайдах пісьмова ўтварыце прыметнікі з дапамогай суфікса – ск –.
*Правяраем сябе з дапамогай слайда з правільнымі адказамі.*

**Фізкультхвілінка**

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
З суседам абдыміцеся,
Вакол сябе  пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

**6. Фарміраванне асноўных ўменняў і навыкаў. Замацаванне.**

- **Тэст - карэктар**

**1.Знайдзіце прыметнікі, у якіх дапушчаны арфаграфічны памылкі. Запішыце словы правільна.**
1.беларускі; 2.сусецкі; 3.гарацкі; 4.салдацкі; 5.казахскі; 6.таджыцкі; 7.мастакскі; 8.навагруцкі; 9.латышскі; 10.французскі.

- **“Хвілінка кемлівасці”**

**Загадка (для хлопчыкаў)**
№1. *22 чалавекі забіць мяне хочуць, як заб’юць, 11 радуюцца, 11 сумуюць, а я жывым застаюся.*
**Пытанне:** што трэба ведаць,каб адгадаць гэтую загадку?
(2 футбольныя каманды і мяч, трэба ведаць, што слова заб’юць мнагазначнае і ўжыта ў значэнні “б’ючы па мячу, прымусіць яго ўляцець у вароты”).

- **Самастойная работа (па варыянтах).**

Заданне: ад назоўнікаў, што ў дужках, пры дапамозе суфікса -ск- утварыце прыметнікі. Правяраем адзін аднаго *(абмен сшыткамі ў парах)* з дапамогай слайда з адказамі.

| | |
|---|---|
| **1**.(Слаўгарад) вуліцы | |
| (людзі) галасы | |
| (ліпень) спёка | |
| (Кубань) казакі | |
| (адвакат) кантора | |
| (ткач) прылады | |
| **2**.(гігант) завод | |
| (Парыж) славутасці | |
| (француз) мастакі | |
| (салдат) жыццё | |
| (рыбак) сетка | |
| (студзень) мароз | |

**Настаўнік.** Звярніце ўвагу на слова студзеньскі! Назавіце яшчэ назвы месяцаў, у якіх бы пісаўся -ь- перад суфіксам –ск-.

*(Ліпень-ліпеньскі, чэрвень – чэрвеньскі, жнівень – жнівеньскі, верасень – верасеньскі, снежань –снежаньскі, студзень – студзеньскі)*

**7. Вынікі ўрока**

**Слова настаўніка**

Роднай мовы яснае світанне
У дзіцячых сэрцах узышло.
Наша мова – чыстая, святая,
Як анёла белага крыло.
Кожны гук душу і сэрца песціць,
Слова – шчырай песняю звініць.
І калі яе шануюць дзеці,
Значыць, гэтай мове вечна жыць!

Сёння мы раскрылі яшчэ адну таямніцу мовы. Давайце успомнім, якія задачы мы ставілі на ўрок, і ці справіліся мы з імі? *(Слайд з апорнымі словамі)*

**Пытанні класу:**

- На што павінна заканчвацца аснова слова, каб далучыўшы да яе суфікс –ск-, атрымалася – цк-?

- калі захоўваецца напісане –ь- перад суфіксам –ск-?

**8. Рэфлексія. Піраміда ведаў** (вучні пазначаюць, на якім узроўні піраміды яны знаходзяцца – 5, 7 ці 9 балаў)

**9. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

**10. Дамашняе заданне**: Пр. 242

*Дадатак*

**Тэставыя заданні для вучняў для актуалізацыі ведаў.**

№ 1
Адзначце радок, у якім запісаны толькі якасныя прыметнікі.
*А) Малады, чырвоны, бабулін;*
*Б) Лясны, жалезны, вясёлы;*
*В) Воўчы, дарагі, кілаграмовы;*
*Г) Салодкі, мяккі, сонечны.*

№ 2
Якія прыметнікі паказваюць на прыналежнасць прадмета чалавеку ці жывай істоце?
*А) Якасныя;*
*Б) Адносныя;*
*В) Прыналежныя.*

№ 3
Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі.
*А) Ранішняя зарадка;*
*Б) Смачны абед;*
*В) Лясная сцяжынка;*
*Г) Залаты пярсцёнак;*
*Д) Хітрая лісіца.*

№ 4
Якім спосабам утвораны прыметнікі водны, маленькі, высачэзны?
*А) Прыставачным;*
*Б) Суфіксальным;*
*В) Прыставачна-суфіксальным;*
*Г) Асноваскладанне.*

## Апорныя фотаздымкі

Фотаздымак 1

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| **прыметнікі з суфіксам -ск-** | |
| утваральная аснова заканчваецца на:<br>**с + -ск- = ск**<br>**ш + -ск- = ск**<br>**д + -ск- = дск [цк]**<br>**ц**<br>**т** **+ -ск- = цк**<br>**ч**<br>**к** | <br>беларус – белару**скі**<br>таварыш - тавары**скі**<br>сусед – сусе**дскі**<br><br>сакавік – сакаві**цкі**<br>брат – бра**цкі**<br>выдавец – ведаве**цкі** |

Фотаздымак 2

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| **прыметнікі з суфіксам -ск-**<br>**геаграфічная назва, назва нацыянальнасці, народнасці** | |
| **г+-ск-=гск**<br>**ж+-ск-=жск**<br>**з+-ск-=зск**<br>**х+-ск=хск**<br>**ш+-ск-=шск**<br>**к+ -ск-=кск** | *Чыкага - чыкагскі*<br>*Варонеж – варонеж**скі***<br>*кіргіз – кіргіз**скі***<br>*Каўказ – каўказ**скі***<br>*казах – казахскі* |
| **Выключэнні!** | ***Волга – волжскі***<br>***Рыга - рыжскі***<br>***калмык - калмыцкі***<br>***турак - турэцкі*** |

Фотаздымак 3

| Правіла | Прыклады |
|---|---|
| **Прыметнікі з суфіксам -ск-** | |
| утваральная аснова закачваецца на:<br>**нь + -ск- = ньск**<br>**(ад назваў месяцаў)**<br>слова ***восень*** **+ -ск- = ньск** | *Студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, жнівеньскі, восеньскі* |
| **нь + -ск- = нск**<br>**(не назва месяца)** | *Смаргонь – смаргонскі,*<br>*Астрахань - астраханскі* |